**Наталя Новік**

# Дзейнасць праваслаўнай царквы па стварэнні прафесійных навучальных установ у другой палове XIX – пачатку XX ст. (на прыкладзе беларуска-літоўскіх губерняў)

**Natallia Novik**

**The activities of the Orthodox Church to establish vocational schools in the second half of XIX – early XX century (in example of the Belarusian-Lithuanian provinces)**

The article shows the role of educational establishments of the Orthodox Church in the system of vocational education on the territory of Belarus in the second half of XIX – early XX c. The activity of the Orthodox Church to establish vocational schools in the teaching and handicraft area are analyzed, also to extent of the agricultural knowledge among the population.

*Keywords:* Orthodox Church, vocational education, teacher training institutions

**Наталя Новік**

**Діяльність православної церкви зі створення професійних навчальних закладів у другій половині XIX – на початку XX ст. (на прикладі білорусько-литовських губерній)**

У статті показано роль навчальних закладів відомства православного віросповідання в системі професійної освіти на території Білорусі в другій половині XIX – початку XX ст. Досліджується діяльність православної церкви зі створення професійних навчальних закладів педагогічного та ремісничого профілю, з поширення сільськогосподарських знань серед населення.

*Ключові слова:* православна церква, професійна освіта, педагогічні навчальні заклади.

У другой палове XIX – пачатку XX ст. праваслаўная царква адыгрывала пэўную ролю ў фарміраванні сістэмы прафесійнай адукацыі, удзельнічала ў стварэнні прафесійных навучальных установ, садзейнічала распаўсюджванню спецыяльных ведаў сярод насельніцтва.

У савецкай гістарыяграфіі пераважала негатыўнае стаўленне да дзейнасці праваслаўнай царквы, падкрэсліваўся яе рэакцыйны ўплыў

на асвету. Рэзкай крытыцы падвяргалася сістэма навучальных устаноў духоўнага ведамства і роля праваслаўнай царквы ў сферы прафесійнай адукацыі[1]. У постсавецкі перыяд даследчыкі пачалі адыходзіць ад ранейшых негатыўных адзнак, што дазволіла па-іншаму зірнуць на гісторыю прафесійных навучальных устаноў, якія знаходзіліся ў падначаленні ведамства праваслаўнага веравызнання, па-новаму ацаніць працу царквы ў галіне духоўнага выхавання вучнёўскай моладзі. Уважлівы аналіз крыніц дазволіў сучасным беларускім гісторыкам больш аб'ектыўна асвятліць некаторыя аспекты праблемы[2]. Разам з тым яшчэ не створана цэласная карціна дзейнасці праваслаўнай царквы па развіцці прафесійнай адукацыі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. на тэрыторыі беларуска-літоўскіх губерняў, у сувязі з чым у нашым артыкуле мы паспрабуем наблізіцца да вырашэння дадзенай задачы.

Адмена прыгоннага права ў Расійскай імперыі паставіла на парадак дня пытанне пра ўзмацненне ўплыву царквы на рэлігійна-маральнае выхаванне народа. Асабліва актывізавалася дзейнасць праваслаўнага духавенства ў адукацыйнай галіне пасля прыняцця ў чэрвені 1884 г. «Правил о церковно-приходских школах», што выклікала хуткі рост царкоўнапрыходскіх школ і школ граматы як у цэлым па краіне, так і ў Віленскай навучальнай акрузе. З гэтага часу пачынае фарміравацца сістэма педагагічных навучальных устаноў, прызначаных для рашэння кадравай праблемы ў школах духоўнага ведамства.

Царкоўна-настаўніцкія школы, спецыяльныя навучальныя ўстановы для падрыхтоўкі педагогаў пачатковых школ ведамства праваслаўнага веравызнання, аднымі з першых пачалі стварацца ў Магілёўскай епархіі. Па сутнасці гэта былі двухкласныя царкоўна-прыходскія школы з дадатковым настаўніцкім курсам на працягу аднаго года. Першая з іх узнікла ў 1884 г. у мястэчку Мілаславічы (Клімавіцкі павет), да 1893 г. у епархіі дзейнічалі сем царкоўна-настаўніцкіх школ. Для іх 18 сакавіка 1890 г. было прынята спецыяльнае «Положение о церковно-учительских школах Могилевской епархии»[3].

Вопыт дзейнасці дадзеных школ улічваўся пры распрацоўцы зацверджанага Мікалаем II 1 красавіка 1902 г. «Положения о церковных школах ведомства православного вероисповедания», якое заканадаўча замацавала два тыпы праваслаўных настаўніцкіх школ: другакласныя (рыхтавалі настаўнікаў для школ граматы) і царкоўна-настаўніцкія

(для царкоўна-прыходскіх школ). У выніку прыняцця палажэння 1902 г. пачаўся працэс рэарганізацыі наяўных і стварэння новых царкоўна-настаўніцкіх школ у межах беларуска-літоўскіх губерняў. У Магілёўскай епархіі да 1905 г. усе царкоўна-настаўніцкія школы былі паніжаны ў статусе і прылічаны да разраду другакласных. У той жа час у Літоўскай і Гродзенскай епархіях з’явіліся тры новыя царкоўна-настаўніцкія школы. Па вызначэнні Св. Сінода ад 4–19 верасня 1902 г. замест другакласнай была заснавана царкоўна-настаўніцкая школа ў мястэчку Баруны Ашмянскага павета Літоўскай епархіі. У разрад царкоўна-настаўніцкіх школ была залічана з пачатку 1904/1905 навучальнага года двухкласная царкоўна-прыходская школа з настаўніцкім курсам, якая існавала з 1887 г. у сяле Трасцяніцы Бельскага павета Гродзенскай епархіі. У пачатку 1907 г. пры Краснастоцкім манастыры Раства Багародзіцы Сакольскага павета Гродзенскай епархіі пачала дзейнасць жаночая царкоўна-настаўніцкая школа, якая атрымала найменне Аляксееўскай у гонар спадчынніка прастола[4].

Царкоўна-настаўніцкія школы былі адносна нешматлікія і не маглі ў дастатковай ступені забяспечыць кадрамі пачатковыя школы духоўнага ведамства. Асабліва востра кадравая праблема стаяла ў школах граматы, кантынгент выкладчыкаў якіх часта фарміраваўся з выпадковых людзей без педагагічнай падрыхтоўкі са слабым агульнаадукацыйным узроўнем. Частка выкладчыкаў школ граматы рыхтавалася ў двухкласных царкоўна-прыходскіх школах з дадатковым настаўніцкім курсам, якія атрымалі найменне другакласных. Вызначаны статус у сістэме педагагічных навучальных устаноў духоўнага ведамства гэтыя школы атрымалі з выданнем 1 красавіка 1902 г. палажэння пра царкоўныя школы і штатаў настаўніцкіх школ. Вучылішчны савет Св. Сінода заняўся рэарганізацыяй другакласных школ на падставе новых нарматыўных дакументаў. Казённае фінансаванне дазволіла развіваць сетку другакласных школ хуткімі тэмпамі, забяспечыць адкрыццё новых і функцыянаванне наяўных навучальных устаноў ва ўсіх беларуска-літоўскіх епархіях.

Праблема жаночага сацыяльнага служэння ў галіне асветы знаходзілася ў цэнтры ўвагі праваслаўнай царквы, таму неад’емны элемент сістэмы педагагічнай адукацыі уяўлялі з сябе прызначаныя выключна для жанчын навучальныя ўстановы духоўнага ведамства – жаночыя духоўныя і епархіяльныя вучылішчы. У верасні 1860 г. узнікла

Парычскае жаночае духоўнае вучылішча (Бабруйскі павет Мінскай губерні). Паўстанне 1863–1864 г. актывізавала працэс адкрыцця жаночых духоўных вучылішчаў, а пасля зацвярджэння ў лістападзе 1863 г. «Устава училищ девиц духовного звания Западных епархий», былі створаны Магілёўскае (1863 г.), Полацкае (1864 г.), Віцебскае (1864 г.) і Мінскае (1864 г.) жаночыя духоўныя вучылішчы[5]. Пры паступленні ў жаночыя навучальныя ўстановы духоўнага ведамства прыярытэт аддаваўся дочкам духавенства, у першую чаргу дзецям-сіротам, якія вучыліся і ўтрымоўваліся бясплатна. На першапачатковым этапе асноўнай мэтай жаночых духоўных вучылішчаў з'яўлялася выхаванне будучых жонак для прыходскіх сельскіх святароў, але паступова на іх пачала ўскладацца задача падрыхтоўкі настаўніц пачатковых школ.

20 верасня 1868 г. імператар Аляксандр II зацвердзіў «Устав епархиальных женских училищ», што азначала з'яўленне новага тыпу жаночых духоўных навучальных устаноў. У навучальных установах духоўнага ведамства пачалася праца па пераходзе на праграмы епархіяльных жаночых вучылішчаў з наданнем іх выхаванкам права на атрыманне звання хатніх настаўніц.

У пачатку XX ст. прадпрымаліся крокі па ўдасканаленні педагагічнай падрыхтоўкі ў жаночых вучылішчах духоўнага ведамства. Яны былі ўраўнаваны ў правах з прагімназіямі, павялічылася іх фінансаванне, адкрываліся царкоўна-прыходскія школы для педагагічнай практыкі выхаванак. Стварэнне дадатковых педагагічных класаў дапамагала выпускніцам епархіяльных вучылішчаў вытрымліваць канкурэнцыю з выпускніцамі жаночых гімназій, якія атрымалі спецыяльную педагагічную падрыхтоўку і мелі перавагі пры прыёме на настаўніцкія пасады[6]. У Парычскім вучылішчы 8-й педагагічны клас быў адкрыты з 1909/10 навучальнага года, у Полацкім – з 6 верасня 1912 г., у Магілёўскім вучылішчы планавалася адкрыць 7-й клас з 1 верасня 1915 г.[7] Акрамя таго, Св. Сінод імкнуўся да пашырэння магчымасцей жанчын у набыцці адукацыі ў другакласных і царкоўна-настаўніцкіх школах, павышэння іх колькасці і дасягнення аднолькавых суадносін мужчынскіх і жаночых педагагічных навучальных устаноў у кожнай епархіі, падкрэсліваў карыснасць выкарыстання патэнцыялу жанчын у педагагічнай галіне у сувязі з тым, што «настаўніцы могуць бліжэй стаяць да дзяцей у школе і ўплываць на іх»[8].

Такім чынам, у другой палове XIX – пачатку XX ст. пад кіраўніцтвам праваслаўнай царквы на тэрыторыі беларуска-літоўскіх епархій дзейнічалі царкоўна-настаўніцкія, другакласныя настаўніцкія школы, жаночыя духоўныя і епархіяльныя вучылішчы, якія стварылі асобны сегмент сістэмы педагагічнай адукацыі. З аднаго боку, іх дзейнасць мела шмат агульнага з педагагічнымі навучальнымі ўстановамі Міністэрства народнай асветы, з другога – характарызавалася адметнымі рысамі ў плане фарміравання кантынгенту навучэнцаў, арганізацыі і зместу навучальнага і выхаваўчага працэсу.

У царкоўна-настаўніцкія і другакласныя школы прымаліся маладыя людзі і дзяўчыны праваслаўнага веравызнання ва ўзросце ад 15 да 17 гадоў. З дазволу Св. Сінода маглі прымацца і тыя, чый узрост перавышаў усталяваны на два гады, адна крабілася гэта толькі для асобаў выключных здольнасцяў і бездакорных паводзін. Перавага пры прыёме надвалася выхаванцам агульнаадукацыйных навучальных установ праваслаўнай царквы, аднак на практыцы выявілася прывабнасць настаўніцкіх школ для выпускнікоў міністэрскіх народных вучылішчаў[9].

Па сацыяльным паходжанні навучэнцы педагагічных навучальных установ духоўнага ведамства амаль цалкам адносіліся да саслоўя сялян, што нагадвала сітуацыю ў настаўніцкіх семінарыях Міністэрства народнай асветы. Гэта было невыпадкова, таму што свецкія і царкоўныя ўлады праследавалі аднолькавую мэту – падрыхтаваць настаўнікаў пачатковых народных вучылішчаў з асяроддзя сялян. У дзейнасці педагагічных навучальных установ ведамства праваслаўнага веравызнання больш выразна праявілася тэндэнцыя да выканання імі функцый сацыяльнай абароны. Напрыклад, палову вучаніц жаночай царкоўна-настаўніцкай школы пры Краснастоцкім манастыры складалі круглыя сіроты, якіх «з дзіцячых гадоў чакала цяжкая перспектыва жабрацтва»[10]. Падчас навучання яны атрымлівалі поўнае ўтрыманне за кошт казённых сродкаў. У некаторых навучальных установах нароўні з казённакоштнымі выхаванцамі былі і тыя, хто часткова ці поўнасцю аплочваў сваё ўтрыманне ў інтэрнаце, ежу, пісьмовыя прыналежнасці, падручнікі і іншыя патрэбы. У асобных школах выкарыстоўвалася форменнае адзенне, у астатніх вучні хадзілі ў звычайнай адзежы[11]. Існавала практыка выдзялення стыпендый, часцей за ўсё валаснымі ўправамі.

Асаблівасці сацыяльнага складу навучэнцаў педагагічных навучальных устаноў духоўнага ведамства абумовілі спецыфіку вырашэння выхаваўчых задач. Імкненне наблізіць лад жыцця да ўмоваў сельскага побыту, падрыхтаваць сціплых і непераборлівых працаўнікоў абумовіла падыходы да арганізацыі выхаваўчай працы. У якасці характэрнага прыкладу можна прывесці жаночую царкоўна-настаўніцкую школу пры Краснастоцкім манастыры, якая, па назіраннях сучаснікаў, была «уладкована на чыста спартанскіх пачатках»: працоўны дзень доўжыўся з 6 гадзін раніцы да 9 гадзін вечара, выхаванкі самі рыхтавалі сабе ежу, мылі бялізну, шылі, прыбіралі спальні, калідоры, класы, пасля ўрокаў працавалі ў садзе і агародзе, шылі рызы і іншыя царкоўныя адзенні, загартоўваліся, ходзячы басанож[12].

Да правераных метадаў выхавання адносіліся ўрачыстыя набажэнствы па выпадку дзяржаўных, праваслаўных свят, юбілеяў навучальных устаноў. Так, калі пачался праца першай Дзяржаўнай думы ў Ізяслаўскай другакласнай школы было адслужана набажэнства, навучэнцаў вызвалілі ад заняткаў і растлумачылі ім значэнне гэтага «важнага моманту дзяржаўнага жыцця». У гэтай школе шырока адзначаліся ўрачыстасці, прысвечаныя 50-годдзю вызвалення сялян, а ў гонар юбілею вайны 1812 г. была заснавана спецыяльная Барадзінская стыпендыя ў памеры 40 руб.[13]

У цэлым, ўвесь лад жыцця ў педагагічных навучальных установах духоўнага ведамства быў накіраваны на тое, «каб выхаваць у дзецях шчырае рэлігійнае пачуццё і дух праваслаўнай царкоўнасці, развіць іх пачуццё абавязку, любові і вольнага падначалення вярхоўнай уладзе і пастаўленым ад яе начальнікам, бацькам і старэйшым па ўзросце, пачуццё таварыства і ўзаемадапамогі, прышчапіць імкненне да парадку ва ўсім, да чысціні і акуратнасці, словам да ўсяго таго, што робіць з іх добрых хрысціян і грамадзян»[14].

У аснову навучальнага плану ўсіх педагагічных навучальных устаноў духоўнага ведамства была пакладзена рэлігійная кампанента, перш за ўсё наяўнасць курсу Закона Божага, які прадугледжваў вывучэнне свяшчэннай гісторыі Ветхага і Новага Запаветаў, вучэння пра набажэнства, катэхізісу, гісторыі царквы. Курс агульнай рускай гісторыі надаваў спецыяльную увагу гісторыі Заходняга краю, асабліва лёсу ў ім праваслаўя. Галоўную складанасць у выкладанні стварала ад-

сутнасць падручнікаў, што вымушала выкладчыкаў самастоўна шукаць адпаведны матэрыял[15]. Сур'ёзная ўвага надавалася вывучэнню рускай і царкоўнаславянскай моў, правільнаму вымаўленню, асэнсаванаму ўспрыняццю тэкстаў, падрыхтоўцы сачыненняў на тэмы, якія патрабавалі самастойных разважанняў і былі блізкія да жыццёвага вопыту навучэнцаў. У Ізяслаўскай другакласнай настаўніцкай школе навучэнцы пісалі сачыненні на наступныя тэмы: «Промыслы ў нашай Мінскай губерні», «Побыт і норавы сялян-беларусаў», «Мая аўтабіяграфія», «Ідэальны настаўнік», «Хароствы вясковага жыцця»[16].

Спецыяльныя веды, неабходныя для працы ў пачатковай школе, выхаванцы атрымлівалі падчас вывучэння педагогікі. Для практычных заняткаў навучэнцаў пры царкоўна-настаўніцкіх школах існавалі двухкласныя, пры другакласных школах – аднакласныя царкоўна-прыходскія школы.

У цэлым праграмы навучання царкоўна-настаўніцкіх школ дасягнулі узроўня настаўніцкіх семінарый Міністэрства народнай асветы і нават яго пераўзыходзілі па асобных дысцыплінах. Царкоўна-настаўніцкія школы беларуска-літоўскіх епархій па некаторых паказчыках знаходзіліся ў больш спрыяльным становішчы ў параўнанні з аналагічнымі навучальнымі ўстановамі іншых рэгіёнаў Расійскай імперыі. Так, у 1907 г. па імперыі выкладчыкі царкоўна-настаўніцкіх школ з вышэйшай адукацыяй складалі 47,3%, а ў беларуска-літоўскіх епархіях – 62,5%. У гэтым жа годзе ўсе царкоўна-настаўніцкія школы беларуска-літоўскіх епархій увайшлі ў лік 9 самых буйных па колькасці навучэнцаў царкоўна-настаўніцкіх школ Расіі[17]. Падрыхтаваныя ў педагагічных навучальных установах беларуска-літоўскіх губерняў кадры былі запатрабаваны ў іншых губернях імперыі. Напрыклад, значная частка выхаванцаў Трасцяніцкай царкоўна-настаўніцкай школы працавала ў царкоўна-прыходскіх школах Холмска-Варшаўскай, Валынскай і Таўрычаскай губерняў[18].

Праграмы другакласных школ забяспечвалі даволі высокі для свайго часу ўзровень агульнаадукацыйнай падрыхтоўкі, часта навучэнцаў прываблівала ў большай ступені іх агульнаадукацыйны, чым настаўніцкі характар. Выпускнікі другакласных школ, якія ўсё ж ішлі працаваць у школы граматы, істотна паляпшалі іх педагагічны склад, абуджалі ў мясцовым насельніцтве цікавасць і давер да гэтых навучальных устаноў.

Цікавым аспектам асветніцкай дзейнасці праваслаўнай царквы з’яўляецца праца па распаўсюджванні сельскагаспадарчых і рамесных ведаў сярод народа. У выкладанні прыкладных ведаў былі найбольш зацікаўлены сяляне, якія чакалі ад школы не толькі атрымання пісьменнасці, але і практычна карысных вынікаў. Духоўнае ведамства падзяляла пазіцыю Міністэрства дзяржаўных маёмасцяў і з’яўлялася прыхільнікам распаўсюджвання аграрна-навуковых ведаў шляхам выкладання сельскай гаспадаркі ў народных школах, бо ў гэтым яно бачыла крыніцу паляпшэння дабрабыту сельскага насельніцтва. З 90-х гг. XIX ст. штогадовую казённую субсідыю на заняткі па сельскай гаспадарцы атрымлівалі такія педагагічныя навучальныя ўстановы, як Трасцяніцкая, Пустынская, Выдранская двухкласныя царкоўна-прыходскія школы з настаўніцкім курсам[19].

У чэрвені 1904 г. Св. Сінод зацвердзіў правілы выкладання сельскай гаспадаркі ў настаўніцкіх школах ведамства праваслаўнага веравызнання, якія рэгламентавалі вывучэнне асноў сельскай гаспадаркі наогул ці асобных яе галін. Мэтамі выкладання лічыліся выхаванне у навучэнцаў прыхільнасці да сельскай працы, засваенне імі звестак, карысных для наступнай дзейнасці сярод сельскага насельніцтва пэўнай мясцовасці. Практычныя заняткі праводзіліся на працягу ўсяго перыяду сельскагаспадарчых прац, пры гэтым імкнуліся ўскладаць педагагічныя абавязкі на асобаў з сельскагаспадарчай адукацыяй, хаця дапускалася выкладанне асобных галін (садоўніцтва, агародніцтва, пчалярства) дасведчанымі настаўнікамі агульнаадукацыйных прадметаў. Правілы прадугледжвалі праверку ведаў вучняў на тэарэтычных і практычных экзаменах, па магчымасці ў прысутнасці мясцовых гаспадароў і прадстаўнікоў Міністэрства земляробства і дзяржаўных маёмасцяў[20].

Выразны сельскагаспадарчы ўхіл адрозніваў царкоўна-настаўніцкую школу ў сяле Трасцяніцы, на ўтрыманне сельскагаспадарчага курсу ў якой дзяржава адпускала 1100 руб. штогод. Спачатку сельскагаспадарчае навучанне мела тэарэтычны характар, але пасля выдзялення школе 6 дзесяцін зямлі навучэнцы пачалі сістэматычна працаваць у агародзе, садзе, на пчальніку пад кіраўніцтвам выкладчыка, які скончыў сярэдняе земляробчае вучылішча ў Горках. З 1909 г. сельскагаспадарчае навучанне ўводзілася ў жаночай царкоўна-настаўніцкай школы пры Краснастоцкім манастыры. Сельская гаспадарка выкладалася

таксама ў Барунскай мужчынскай царкоўна-настаўніцкай школе. У 1910 г. заняткі па сельскай гаспадарцы ў Ізяслаўскай другакласнай школе пачаліся з сярэдзіны красавіка. Вучні апрацавалі зямлю лапатамі пад агарод, пасадзілі каля 100 дэкаратыўных і 25 пладовых дрэў, трускаўку, маліну, бульбу,  пасеялі ячмень, авёс, кармавыя травы, пазнаёміліся з правіламі ўнясення мінеральных ўгнаенняў[21]. У выніку выпускнікі педагагічных навучальных устаноў духоўнага ведамства валодалі некаторымі ведамі па садоўніцтве, агародніцтве, пчалярстве, іншых галінах земляробства і сваёй педагагічнай дзейнасцю спрыялі распаўсюджванню палепшаных прыёмаў сельскагаспадарчай вытворчасці.

Па ініцыятыве царквы ствараліся асобныя рамесныя навучальныя ўстановы. Рамесная школа пры Мінскім Свята-Духавым манастыры, адкрытая ў 1875 г., ставіла за мэту навучанне дзяцей святароў асновам пераплетнага і сталярнага рамёстваў[22]. Аднак асноўная праца духоўнага ведамства па распаўсюджванні рамесных ведаў праводзілася шляхам выкладання рамёстваў у пачатковых агульнаадукацыйных школах. З 1898 г. пачалі рэгулярна вылучацца сродкі на арганізацыю рамесных аддзяленняў пры мужчынскіх школах і рукадзельных класаў пры жаночых школах духоўнага ведамства[23].

Падводзячы вынікі, неабходна падкрэсліць, што ў агульную структуру прафесійнай адукацыі Беларусі ўваходзілі навучальныя ўстановы, якія падпарадкоўваліся ведамству праваслаўнага веравызнання і вырашалі выхаваўчыя, адукацыйныя і сацыяльныя задачы. Нягледзячы на адносна невысокую ўдзельную вагу навучальных устаноў духоўнага ведамства ў сістэме прафесійнай адукацыі Беларусі, праваслаўная царква здолела заняць адметнае месца ў галіне педагагічнай, сельскагаспадарчай, рамеснай адукацыі. Пры гэтым характэрна, што адукацыйная дзейнасць царквы распаўсюджвалася на ўсе пласты насельніцтва, а не толькі на духавенства. Выкладанне сельскай гаспадаркі і рамёстваў у педагагічных і агульнаадукацыйных школах ведамства праваслаўнага веравызнання сведчыла пра важную асветніцкую ролю ў справе распаўсюджвання сярод народа прафесійных ведаў. Жаночыя навучальныя ўстановы духоўнага ведамства істотна пашырылі магчымасці жанчын для занятку педагагічнай дзейнасцю, павялічыўшы іх удзельную вагу сярод настаўнікаў пачатковых школ

беларуска-літоўскіх губерняў. Дзейнасць педагагічных навучальных установ духоўнага ведамства дазволіла ў адносна невялікі тэрмін палепшыць педагагічны склад пачатковых царкоўных школ, што ў канчатковым выніку спрыяла павышэнню агульнага адукацыйнага ўзроўня насельніцтва Беларусі.

[1] Абраменко М. Н. Низшая профессиональная школа в дореволюционной Белоруссии. – Минск: Вышэйшая школа,1975. – С. 39-41; Кравцов А. И. Педагогическое образование в Белоруссии в дооктябрьский период // Ученые записки Минского педагогического института иностранных языков. – 1958. – Выпуск 1. – С. 9, 16, 53. – (Серия педагогическая).

[2] Восович С. М. Церковно-учительские школы Св. Синода на территории пяти белорусско-литовских епархий // X Международные Кирилло-Мефодиевские чтения, посвященные Дням славянской письменности и культуры «Церковь и информационно-образовательное пространство»: Материалы чтений (Минск, 24-26 мая 2004 г.): В 2 ч. – Ч. 1 / Институт теологии им. Свв. Мефодия и Кирилла, Бел. гос. ун-т культуры и искусств; Отв. ред. А. Ю. Бендин. – Минск: ООО «Ковчег», 2005. – С. 216-223;

Ее же. Благословенный знаний свет. Подготовка учителей начальных школ учебными заведениями духовного ведомства в Беларуси в 1884-1914 гг // Беларуская думка. – 2008. – № 8. – С. 52-57;

Гулюк М. А. Женские духовные училища в образовательной политике российского правительства в белорусских губерниях (вторая половина XIX – начало XX в.) // Веснік ВДУ. – 2005. – № 1. – С. 26-29;

Ступакевич М. А. Женское образование в Беларуси (Вторая половина XIX в. – 1917 г.). – Гродно: ГрГУ, 2006. – 170 с.;

Васовіч С. М., Зянюк Р. У., Філатава А. М. Асветніцкая дзейнасць духавенства // Канфесійны фактар у сацыяльным развіцці Беларусі (канец XVIII – пачатак XX ст. / Навук. рэд. В. В. Яноўская [і інш.]; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск: Беларуская навука, 2015. – С. 327-368.

[3] Восович С. М. Благословенный знаний свет. Подготовка учителей начальных школ учебными заведениями духовного ведомства в Беларуси в 1884-1914 гг. – С. 55-56.

[4] Исторический очерк развития церковных школ за истекшее двадцатипятилетие (1884-1909). – СПб.: Училищ. Совет при Святейшем Синоде, 1909. – С. 325-326.

[5] Гулюк М. А. Женские духовные училища в образовательной политике российского правительства в белорусских губерниях (вторая половина XIX – начало XX в.). – С. 26.

[6] Андреева Е. А. Епархиальные женские училища в России // Педагогика. – 1999. – № 3. – С. 91.

[7] Ступакевич М. А. Женское образование в Беларуси (Вторая половина XIX в. – 1917 г.). – С. 113.

[8] Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей – НГАБ). – Ф. 482. – Воп. 1. – Спр. 1. – А. 28.

[9] Тамсама. – Спр. 2. – А. 21.

[10] Кречетович А. Поездка в Красносток (путевые заметки). – Вильно: Тип. М. Р. Ромма, 1904. – С. 20.

[11] Минские епархиальные ведомости. – 1905. – № 18. – С. 354.

[12] Кречетович А. Поездка в Красносток (путевые заметки). – С. 22-25.

[13] НГАБ. – Ф. 482. – Воп. 1. – Спр. 9. – А. 116-117.

[14] Тамсама.– Ф. 2502. – Воп. 1. – Спр. 632. – А. 8-8 адв.

[15] Тамсама. – Ф. 482. – Воп. 1. – Спр. 2. – А. 78-78 адв.

[16] Тамсама. – Спр. 1. – А. 54.

[17] Восович С. М. Церковно-учительские школы Св. Синода на территории пяти белорусско-литовских епархий. – С. 221.

[18] Отчет Гродненского губернского отделения Литовского епархиального училищного совета о состоянии школ церковно-приходских и грамоты в Гродненской губернии за 1896/7 учебный год. – Гродно: Губернская типография, 1898. – С. 26-27.

[19] Исторический очерк развития церковных школ за истекшее двадцатипятилетие (1884–1909). – С. 378-380.

[20] НГАБ. – Ф. 482. – Воп. 1. – Спр. 1. – А. 18-18 адв.

[21] НГАБ. – Ф. 482. – Воп. 1. – Спр. 2. – А. 87.

[22] Минские епархиальные ведомости. – 1875. – № 2. – С. 25.

[23] Исторический очерк развития церковных школ за истекшее двадцатипятилетие (1884–1909). – С. 269.